# Выстаўкі да Дня Перамогі

У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна, а таксама ў бібліятэках імя Горкага, імя Пушкіна, акруговага Дома афіцэраў і Дома партыйнай асветы адкрыліся выстаўкі, прысвечаныя Дню Перамогі.

На стэндах—кнігі, часопісы, фотадакументы, у якіх адлюстравана гераічная барацьба савецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Рад дакументаў апавядае аб разгроме немцаў пад Масквой, аб бітвах пад Сталінградам і пад Курскам, на палях Савецкай Беларусі.

На выстаўцы ў бібліятэцы імя Горкага прадстаўлен зборнік артыкулаў, дакладаў і выступленняў В. І. Леніна і І. В. Сталіна, прысвечаных абароне Айчыны. Цэнтральнае месца на выстаўцы адведзена паказу выключнай ролі вялікага Сталіна ў забеспячэнні перамог савецкага народа.

На стэндах выставак экспаніруюцца таксама шматлікія дакументы аб барацьбе Савецкага Саюза за мір і дружбу народаў, супроць падпальшчыкаў новай вайны.